УДК 372.8:811.161.3

# ТЭАРЭТЫЧНЫЯ АСНОВЫ ВЫПРАЦОЎКІ НАВЫКАЎ ДЫЯЛАГІЧНАГА МАЎЛЕННЯ Ў МАЛОДШЫХ ШКОЛЬНІКАЎ

З.І. ЛАЗАРАВА
Навуковы кіраўнік В.М. САЎЧАНКА, канд. філал. навук
УА «МАГІЛЁЎСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ УНІВЕРСІТЭТ імя А.А. Куляшова»
г. Магілёў

Дыялагічнае маўленне характарызуецца перш за ўсё маўленчай і мысліцельнай дзейнасцю вучняў. У аснове дыялога ляжыць рэпліцыраванне (абмен думкамі). Дыялагічны працэс прадугледжвае пастаяннае пераключэнне з слухання на маўленне, г.зн. з успрымання, прагназавання, разумення на планаванне і ўсвядомленае ўзнаўленне ўласнага маўлення. У сувязі з адзначанымі ўласцівасцямі маўленне можна лічыць рэцэптыўна-прадуктыўным відам маўленчай дзейнасці. Інтэнсіўнасць абмену думкамі залежыць ад падрыхтаванасці моўнага матэрыялу і магчымасці яго свабоднага ўзнаўлення. Характар маўленчых паводзін партнёраў вызначаецца канкрэтнай сітуацыяй. Як і любой форме вуснага маўлення, дыялагічнаму маўленню ўласціва эмацыянальнасць і матывацыйная забяспечанасць (пры гэтым матывы партнёраў могуць не супадаць, што вызначаецца самім працэсам і вынікам зносін).

Псіхалагічныя асаблівасці ўплываюць на лінгвістычныя характарыстыкі дыялагічнай формы зносін, да якіх трэба аднесці эліптычнасць маўлення, прымяненне спецыфічных сінтаксічных канструкцый, наяўнасць маўленчых стандартаў, ужыванне мадальных слоў, выклічнікаў і іншых сродкаў экспрэсіўнасці. Дыялагічная форма зносін прапануе шырокае выкарыстанне экстралінгвістычных сродкаў (мімікі, жэстаў). Элементарнай структурнай адзінкай дыялога з’яўляецца рэпліка, аднак зыходнай асновай навучання прынята лічыць дыялагічнае адзінства (ДА), якое ўтвараецца парай рэплік, адна з якіх – рэпліка-стымул, другая – рэпліка-рэакцыя. У аснове функцыянальнай тыпалогіі дыялагічных адзінстваў ляжаць розныя спосабы злучэння рэплік:

– пытанне – адказ;
– пытанне – контрпытанне;
– паведамленне – пытанне;
– паведамленне – сустрэчнае паведамленне;
– запрашэнне (просьба) – згода (нязгода);
– паведамленне (загад, просьба) – эмацыянальная рэакцыя;
– просьба – паведамленне;
– паведамленне – просьба.

Названыя разнавіднасці ДА вызначаюць тыпы дыялогаў, сярод якіх асноўнымі для школьных заняткаў лічацца наступныя:

1) дыялог – аднабаковае апытванне (тыпу інтэрв’ю);

2) дыялог – двухбаковае апытванне;

3) дыялог – абмен думкамі;

4) дыялог – волевыяўленне.

Указаныя тыпы з’яўляюцца больш буйнымі адзінкамі дыялагічнага маўлення, але ў іх аснове ляжаць аднатыповыя ДА, якія знаходзяцца ў лагічна-сэнсавай залежнасці. Такія дыялогі прынята называць мікрадыялогамі. Самая буйная структурная адзінка дыялагічнага маўлення – тэматычны макрадыялог, які ўключае ў сябе некалькі мікрадыялогаў, аб’яднаных адной сітуацыяй зносін.

Найвышэйшы ўзровень валодання дыялагічным маўленнем дапускае ўвядзенне адносна натуральнай і разнастайнай у структурных адносінах гутаркі, парнай ці групавой. Акрамя таго, у методыцы прынята размяжоўваць свабодныя і стандартныя дыялогі (дыялогі этыкетнага характару). Апошнія абслугоўваюць сітуацыі з дакладна замацаванымі ролямі (пакупнік – прадавец, доктар – хворы і г.д.) і дапускаюць наяўнасць тыповага моўнага матэрыялу.

У адпаведнасці з патрабаваннямі Праграмы навучання беларускай мове ў пачатковай школе вучні павінны авалодаць уменнем удзельнічаць у зносінах з мэтай абмену інфармацыяй, пабуджэння субяседніка да выканання якога-небудзь дзеяння ці дзейнасці ў сувязі з прапанаванай сітуацыяй зносін, г.зн. авалодаць усімі тыпамі мікрадыялогаў. Дасягненне ўказанай мэты немагчыма без навучання рэпліцыраванню (стымуляванню і рэагаванню) і разгортванню адной з рэплік у звязнае выказванне. Гэтыя ўменні складаюць псіхалагічны кампанент зместу навучання дыялагічнаму маўленню. Лінгвістычны кампанент у сваю чаргу ўключае ўвесь неабходны моўны і маўленчы матэрыял (ад стандартных этыкетных формул, характэрных для дыялагічнага маўлення, рэплік-пабуджэнняў, рэплік-рэакцый, тыповых дыялагічных адзінстваў да дыялогаў-узораў, адабраных у адпаведнасці з сітуацыямі, сферамі зносін і тэматыкай праграмы навучання). Выпрацоўка навыкаў дыялагічнага маўлення суправаджаецца ўменнем карыстацца рознымі апорамі: зрокавымі і слыхавымі, вербальнымі і невербальнымі, змястоўнымі і сэнсавымі.

Авалоданне дыялагічным маўленнем вызначае не толькі тэндэнцыі развіцця моўна-камунікацыйнай культуры вучняў, але і дазваляе ўплываць на гэты працэс, садзейнічаць рэальнаму, мэтанакіраванаму падпарадкаванню маўленчай дзейнасці вучняў нормам літаратурнай мовы, праводзіць сістэматычную моўную падрыхтоўку. У выніку працы па развіцці дыялагічнага маўлення фарміруецца эстэтычны густ вучня, спасцігаецца нацыянальная культура, паляпшаецца засваенне іншых вучэбных дысцыплін.